организационно) от государства социальных структур и институтов, преследующих в рамках закона свои частные цели и интересы. Эти интересы могут также выражаться в теоретической форме. Материальная, организационная и финансовая поддержка общественными фондами независимых социальных исследований – важное условие формирования подлинного духовного и идеологического плюрализма, критического мышления.

Общий успех модернизации, построения в нашей стране основ информационно-коммуникативного общества неотделим от фундаментальных социальных реформ и изменения общественного сознания. Трансформация последнего связана с превращением пока еще аморфных структур белорусского менталитета в внутренне дифференцированную интеллектуальную культуру социума, фундированную ценностями свободы, творчества, гуманизма, патриотизма, национального и личностного достоинства.

**Литература и источники**

1. История философской мысли Беларуси: учеб. Пособие / Г. И. Малыхина [и др.] // Под ред Г. И. Малыхиной, В. И. Миськевича. – Минск: Вышэйшая школа, 2014. – 255 с.

## БЕЛАРУСКАЯ ФІЛАСОФІЯ АБО ФІЛАСОФІЯ Ў БЕЛАРУСІ?

*А. П. Мядзель*

Раскрыццё зместу нацыянальнага характару філасофіі ў кантэксце будаўніцтва незалежнай дзяржавы ўяўляецца надзвычай актуальным. Сярод шэрагу азначэнняў беларускай філасофіі найбольш удалым падаецца падыход, які вызначае нацыянальную беларускую філасофію формай абгрунтавання існавання беларусаў як нацыі [1, с. 32]. Пры гэтым асноўным крытэрыем выдзялення нацыянальнай філасофіі выступаюць яе спецыфічныя светапоглядныя і метадалагічныя ўстаноўкі. Вобразна кажучы, нацыянальная філасофія ўяўляе сабой спелы плод на дрэве развітай і магутнай нацыянальнай культуры. Адпаведна, ацэньваць стан і перспектывы развіцця беларускай філасофіі магчыма толькі на фоне глыбокага і ўсебаковага аналізу беларускай нацыянальнай культуры ў цэлым.

Сучасная філасофія Захаду пры ўсёй разнастайнасці яе школ і накірункаў вырасла з калыскі антычнай культуры. Апошняя ў сваіх анталагічных падставах уяўляе сабой цэласнае адзінства. Сярэднявечныя філасофскія штудыі былі замкнёныя ў межах адзінага хрысціянскага веравучэння. Толькі з надыходам Адраджэння і Рэфармацыі выяўляюцца спецыфічна нацыянальныя рысы філасофскага мыслення. Іх узнікненне

было абумоўлена фарміраваннем нацыянальнай ідэнтычнасці еўрапейскіх народаў, адукацыяй нацый і заснаваннем нацыянальных дзяржаў.

Вырашальнымі геапалітычнымі фактарамі, якія вызначылі драматычны накірунак і часта трагічны працэс развіцця нацыянальнай беларускай культуры сталі памежнае становішча беларускіх зямель паміж Захадам і Усходам як двума магутнымі цывілізацыйнымі цэнтрамі, а таксама адсутнасць працяглай гісторыі існавання ўласнай дзяржаўнасці. Пачарговы ціск з Усходу і Захаду іншых культур – часта ў выглядзе ваеннай экспансіі – спарадзіў феномен «тутэйшасці», пры якім чалавек атаясамліваў сябе не з пэўным этнасам, а з канкрэтнай тэрыторыяй пражывання. Адбыўся трагічны разрыў паміж элітай грамадства, якая прымала культурныя парадыгмы больш магутных суседзяў, і народнымі масамі, абмежаванымі рамкамі традыцыйнай архаікі, што падтрымлівалася стратэгіямі выжывання.

Творчасць выбітных мысляроў беларускіх зямель перыядаў ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі пры ўсёй яе значнасці для фарміравання інтэлектуальнай культуры Беларусі не можа прэтэндаваць на статус нацыянальнай беларускай філасофіі. Яны выступалі як папулярызатары перадавых ідэй еўрапейскага Рэнесансу і Асветы, адаптуючы іх да мясцовых умоў [2, с. 311]. У другой палове XIX стагоддзя з развіццём нацыянальна-вызваленчага руху асаблівую вастрыню набываюць пытанні нацыянальнага самавызначэння і пошуку нацыянальнай ідэнтычнасці, але адказы на іх дае не прафесійны філасофскі дыскурс, а літаратурная творчасць і публіцыстыка класікаў айчыннай літаратуры. Толькі на пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя з'яўляюцца першыя працы, аўтары якіх прапануюць сапраўды нацыянальны філасофскі адказ на светапоглядныя пытанні: «Адвечным шляхам (дасьледзіны беларускага сьветапогляду)» (1921) Ігната Абдзіраловіча (Канчэўскага) і «Гэтым пераможаш. Нарыс крытычнага аптымізму» (1924). Сулімы (Ул. Самойлы).

Вырашальнае значэнне для развіцця філасофіі ў Беларусі меў савецкі перыяд. Менавіта ў БССР філасофія была інстытуцыяналізавана і набыла статус прафесійнай сферы дзейнасці. Адкрыццё кафедраў грамадскіх навук у ізноў створаных вышэйшых навучальных установах, з'яўленне ў структуры Акадэміі Навук БССР Інстытута філасофіі прадвызначылі поспехі беларускіх даследчыкаў у самых розных галінах філасофскіх ведаў. Сусветнае прызнанне атрымалі працы вучоных Беларусі па тэорыі і метадалогіі навуковага пазнання, даследаванні сацыяльных працэсаў, вывучэнні праблем рэлігіі і вальнадумства. Разам з гэтым дасягненні савецкага перыяду ажыццяўляліся ў кантэксце «адзіна дакладнага вучэння» марксісцкай філасофіі ў яе ленінска-сталінскай інтэрпрэтацыі часцей як своеасаблівае адхіленне ад «генеральнай лініі». Непрацяглы перыяд беларусізацыі 20-х гадоў XX стагоддзя змяніўся жорсткім

пераследам найменшых праяў нацыянальнай самабытнасці за выключэннем яе этна-фальклорных формаў. Своеасаблівай мяжой у гэтай справе стала калектыўная праца Інстытута філасофіі АН БССР «"Навука" на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі»(1931), якая на многія гады блакавала навуковы пошук у галіне гісторыі нацыянальнай філасофскай думкі [3, с. 23].

Набыццё дзяржаўнага суверэнітэту нашай дзяржавай стварыла рэальныя ўмовы для станаўлення нацыянальнай беларускай філасофіі. На дадзены момант можна гаварыць толькі аб пачатковай стадыі гэтага працэсу. Як ужо адзначалася, нацыянальная філасофія з'яўляецца вынікам і чыннікам сталасці нацыянальнай культуры. Беларуская культура ў значнай ступені працягвае заставацца ў стане дыфузіі. Адсутнічае нацыянальная ідэя для Беларусі, а яе стварэнне застаецца справай будучыні. Актуальнымі задачамі філасофіі на сучасным этапе яе развіцця з'яўляюцца даследаванне праблемы ўзаемасувязі нацыянальнай ідэнтычнасці з універсальнымі гуманістычнымі ідэаламі чалавецтва, вызначэнне спосабаў злучэння агульначалавечых каштоўнасцяў і асаблівасцяў менталітэту і культуры беларускага народа.

**Літаратура і крыніцы**


1. Белорусская философская традиция как феномен духовной культуры (материалы круглого стола) // Философские исследования. Сборник научных трудов. – Минск: Беларуская навука, 2017. – Вып. 4.
2. Евароўскі, В. Б. Нацыянальная філасофія Беларусі: тэорыя, архелогія, гісторыя, генеалогія, школа / В. Б. Евароўскі. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 559 с.
3. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. – Т. 1: Эпоха Сярэднявечча. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 578 с.


## РУКАПІС XVI СТ. «АРЫСТОЦЕЛЕВЫ ВАРОТЫ» – ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ СЯРЭДНЯВЕЧНАГА МЫСЛЕННЯ


*А. А. Падалінская*


Выдатны старажытнагрэчаскі філосаф Арыстоцель пакінуў пасля сябе багатую філасофскую спадчыну. Імя Арыстоцеля было настолькі папулярным, а ісцiннасць палажэнняў настолькі бясспрэчнай, што, пачынаючы з позняй антычнасці, а асабліва ў эпоху сярэднявечча, яго імем сталі падпісваць альбо ўласныя творы, альбо ананімныя кампендыумы, створаныя на аснове яго твораў паслядоўнікамі. З'яўленне псеўда-Арыстоцеля ў эпоху сярэднявечча было звязана з ананімным характарам сярэднявечнай культуры, калі аўтарства прыпісвалася той ці іншай асобе, якая карысталася аўтарытэтам, тым самым сцвярджалася значнасць ісцін,